Асоба і час

# КАЗІМІР КАМЕЙША:

# *«Неба веку твайго – узлёт высокі...»*

ЭСЭ, РОЗДУМ НАД ПЕРАЖЫТЫМ
І НАПІСАНЫМ,
СЯБРОЎСКАЕ СЛОВА

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2023

УДК 821.161.3.09+929 Камейша
ББК 83.3(4Беи)
К14

*Серыя заснавана ў 2008 годзе*

Рэдакцыйны савет:
Анатоль Аўруцін, Ліліяна Анцух, Уладзімір Гніламёдаў,
Алесь Карлюкевіч, Алесь Марціновіч, Міхась Пазнякоў,
Валянціна Паліканіна, Зіновій Прыгодзіч

К14 **Казімір** Камейша: «Неба веку твайго — узлёт высокі…» : эсэ, роздум над перажытым і напісаным, сяброўскае слова. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2023. — 164 с. : [8] л. укл. — (Асоба і час).
ISBN 978-985-581-643-1.

Новая кніга вядомага беларускага паэта «Казімір Камейша: “Неба веку твайго — узлёт высокі…” працягвае серыю «Асоба і час». Змест яе — спроба прайсці яшчэ раз тымі шляхамі, якія выпалі на гады яго жыцця і творчасці, пачынаючы ад дзяцінства і паступова вяртаючыся ў дзень сённяшні. У гэта цікавае падарожжа аўтар адпраўляецца не адзін, а запрашае і сваіх сяброў, калег па пяры, што былі сведкамі згаданых паэтам падзей. Ну і, вядома ж, сваіх зацікаўленых чытачоў.

**УДК 821.161.3.09+929 Камейша**
**ББК 83.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-581-643-1**

© Камейша К. В., 2023
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2023

# НА СТЫКУ ДВУХ ВЯКОЎ

## ГАЛОЎНАЯ ВЯРСТА

Аўтабіяграфія

У кожнага яна свая, тая самая галоўная вярста. Чужой нейкай прайсці немагчыма. Нават сваёй ніколі не паўторыш. Можна хіба прайсціся памяццю. Ды і яе недастаткова. Трэба звяртацца да памяці бацькоў, родных, блізкіх. Але і тады ўсё будзе ў межах прыблізнасці. Галоўная мая вярста складвалася з мноства маленькіх і вялікіх дарог, карэністых пушчанскіх сцяжын, старых польскіх брукаванак і новых струністых асфальтовак, лясістых гасцінцаў і ўтравелых бальшакоў. Вяртацца ж туды, у самы пачатак, нават памяццю бацькоў страшнавата. Бо там ідзе вайна, канчаецца 1943 год. Чацвёрты, суботні, дзень снежня сапраўды снежны і марозны. І тут раптам я падаю свой голас, крычу, каб ведалі, што яшчэ адзін пушчанец з'явіўся на гэты свет.

Налібоцкая пушча быццам патанула ў снезе. Невядома, што робіцца ў лясных вёсках. Дзесьці атабарыліся партызаны, дзесьці гаспадарыць самаахова. У прылесных Малых Навіках ціха і спакойна. Задумліва цягнуцца з комінаў дымкі, нехта бразгае вёдрамі ля абледзянелага калодзежа. Звечара ўчора наязджалі партызаны ды падаліся па цаліку на зарэчныя хутары. Цярушыць бязважкі сняжок, і саням-роскідам лёгка бяжыцца па амаль няезджанай дарозе на Рубяжэвічы. Конь у кума Вацлава Тарайковіча гладкаваты, добра прыкормлены сенам пасля цяжкой восені, бяжыць, аж грыва пасвістае на ветры, а кума Ядвіся Гроць усё прыкалыхвае ды прытульвае да грудзей маленькі белы скрутак, які час ад часу падае свой пранізлівы галасок. Яшчэ ў дарозе кум вырашыў не рызыкаваць, у мястэчка на кані не заязджаць, а прыхаваць гнядога

ў густым кустоўі ля рэчкі Перакуль і да касцёла адправіцца пешшу, хоць і далекавата. А то, не дай Божа, каму з «гаспадароў» мясцовых упадабаецца конь, тады ўсё, дамоў давядзецца вяртацца сваімі нагамі. Беражонага, як кажуць, Бог беражэ.

Хрысціў мяне і бласлявіў на галоўную вярсту ксёндз Тарасевіч. А потым спраўлялі хрэсьбіны. І поўную чарку пушчанскай моцы падымалі за мяне разам са сваякамі і налібоцкія партызаны.

Я добра помню і сваю драўляную калыску на высокіх дугастых ножках з драбіністымі білцамі, бо і сам потым калыхаў у ёй малодшых сястру Ванду і брата Януша. Сумны позірк майго ўспаміну перакідваецца з калыскі на маленькую труну, у якой сястрычка ці не праз паўгода ад нараджэння адплыла ў іншы свет.

Летам 1943 года пушчу сціскала сваімі вогненнымі кругамі блакада. Карнікі з батальёна Дырлевангера прачэсвалі ў пушчы кожны куточак, абнюхвалі кожны куст; у кронах густых дрэў, прытаіўшыся, нават асцярожны крок адсочвалі снайперы, стралялі знянацку. Палалі вёскі, паветра на многія вёрсты прапахла гарам і порахам. Карнікі ўжо выходзілі з пушчанскіх гушчароў, падпалілі на сваім шляху Янкавічы, родную вёску пісьменніка Генрыха Далідовіча, кіраваліся да Рубяжэвіч. Прайшлі і праз Малыя Навікі, прыхапіўшы ў свой доўгі абоз сяго-таго з мужчын, кагосьці добра «перахрысціўшы гумай», але вёскі самой не зачапілі, бо ўжо ўдосталь «нагрэліся» ў пушчы. Калі калона схавалася за гарою, жанчыны жагналіся: «Можа, і пранясло».

Я нарадзіўся ўжо пасля тых горкіх падзей. Неўзабаве пасля гэтага адвезлі мяне да дзеда ў Астравы. Дзед Казімір Радзівон (імя ў мяне ад яго) жыў на лясным хутары, там і прайшлі мае першыя дзіцячыя гады. Як праз нейкі туман, бачу вароты ў двары, шуло, а ля яго надта роўны, як слуп, стаіць чалавек, а над ім яшчэ тырчыць нешта доўгае і вострае. Здагадваюся зараз, што гэта быў вартавы. Вось такі самы першы жыццёвы ўспамін. Колькі ж гадкоў мне было тады? Думаю, што не больш за два. А потым успаміны пойдуць больш выразныя, туман пачне рассейвацца. І ўбачу я той жа самы двор, асляплены яркім летнім сонцам, прыземісты, пры саламянай стрэшцы склеп, і сядзіць ля яго, сагнуўшыся, чарнявы, як шпачок, хлапчук ды каменем клепле нейкую круглую

з даўгаватай ручкаю жалязяку. Хтосьці падбягае і выхоплівае з рук у мяне тую «цацку». Зараз разумею, што гэта была граната.

Мы — дзеці вайны, і ў нас свае, ваенныя, цацкі. Мне надта ж падабаюцца вінтовачныя патроны з бліскучымі джальцамі куляў, якія дзядзька, малодшы матчын брат, з лесу цягае кішэнямі. На грудзе, пры канаве, дзе пасвяцца хутаранскія каровы, тыя патроны сыплюць шапкамі ў вогнішча, і яны весела пастрэльваюць, раскідваючы ў бакі гарачае вуголле.

Свежай засталася ў памяці прыгадка пра бярозавік. Наш лес, што ламанай паласой цягнуўся ад гумна, быў нібыта падбелены з самага краю галіністымі бярозамі. Вясна прыходзіла са сваім святам бярозавіку. Раніцай на ўзлеску з'яўляліся глыбакаватыя, выдзеўбаныя долатам яшчэ надоечы карытцы. Першы сок, празрыста-сіняваты, пырскаў у вочы, потым доўгімі рассыпістымі кроплямі каціўся па кары і, нарэшце, паслухмяна з латака капаў у карытца. Я добра памятаю смак яго, яшчэ мала падкіслага, зачэрпанага старой меднай конаўкай з высокай драўлянай кадзі, што стаяла ў гумне, пры сене.

Сон на сене — гэта своеасаблівая летняя казка, якая штогод прыходзіла пад дах з квяцістага медунічнага лугу. Па лесвіцы забіраліся на тую духмяную вышыню і спалі ўсім гуртам (дзве дзедавы дачкі Маня і Ванда, яго сын Каролік і я, унук), праваліўшыся ў цёплую і мяккую нару. На сене хораша засыналася пад шапаценне на страсе спорнага летняга дажджу. Раніца страляла ва ўсе шчыліны паламанымі промнямі сонца, весела паблісквала павучынымі ўзорамі, свіргатала ластаўкамі.

Грыбы і ягады таксама раслі пры самым гумне, якое мне сніцца часта і сёння. Недалёка ад гумна — высокая букецістая арэшына. Была яна надзіва пладавітай. Арэхі на ёй выспявалі ядраністыя, звісалі з галін цэлымі шышкамі. Ні ад гумна, ні ад самога хутара не засталося і знаку. Даўно зааралі яго калгасныя трактары. А вось лес застаўся, быў ён калісьці ўласнасцю майго бацькі, бо атрымаў яго як пасаг падчас шлюбавання з дзедавай дачкой Ядвігай, маёй, значыць, маці. Старэйшыя яшчэ і сёння называюць яго Вінцуковым лесам. І наша першая вясковая хата многімі сваімі вянцамі адсюль, з бацькавага лесу.

Да дзедавага хутара я не тое што прывык, а закараніўся ў ім усёй сваёй дзіцячай душой, нават лічыў сябе паўнапраўным дзедавым сямейнікам, а бабулю доўгі час называў мамай, бо гэтым словам называлі яе ўсе астатнія, з кім я жыў, еў і спаў. І доўга яшчэ не мог зразумець, хто ж яна для мяне такая, якую трэба называць цяпер мамусяй. У ганаровых шляхцюкоў-засцянкоўцаў не было слоў «тата» і «мама», іх замянялі больш ласкавыя — «татусь» і «мамуся». Доўга я не адважваўся назваць сваю маму мамай.

Малыя вельмі лёгка перахопліваюць звычкі старэйшых, без цяжкасці завучваюць і пераймаюць іхнія словы. Ад дзядзькі я «напазычаў» добры тузін мацерных слоў. Казалі, з вуснаў маіх часам можна было пачуць і нейкае двух- і трохпавярховае брыдкаслоўе. Відаць, сам дзядзька выцягваў значна вышэй. Не разумею толькі, адкуль гэта ўсё прыходзіла на глухі пушчанскі хутар. А вось ад цёткі Ванды пачуў я і мілагучнае паэтычнае слова. Калі яна вечарамі завучвала на памяць вершы, паўтараючы па многа разоў адны і тыя ж радкі, у маёй памяці яны запісваліся адразу і назаўсёды. Раніцой, адыходзячы ў школу, цётка зноў, мыляючыся, паўтарала сваё зубрэнне, а я пасмейваўся, цытуючы ўсё без запінкі. Гэтак лёгка далася маёй памяці «Кацярына» Петруся Броўкі. Усё гэта весяліла і надта радавала дзеда.

Урос я ў дзедаву сям’ю, як той маленькі жывучы карэньчык, што ўжо і вырываць шкада. А трэба — падпірае школа. Пяты год пайшоў. І, разумеючы ўсё гэта, з’яўляецца аднойчы бацька, прыязджае на сляпым, падораным партызанамі кані «вырываць» той «карэньчык». А я не хачу, уцякаю ў лес. Каб усадзіць мяне на воз, спатрэбілася паўдня. Нарэшце сілаю ўсадзілі — і па кані. Воз аж падскоквае, імчыцца па каляіністай ды карэністай дарозе да гасцінца, а я плачу ды такімі жаласлівымі слязьмі, ажно ва ўсёй дзедавай сям’і слёзы наварочваюцца. Асабліва жаласна бабе Зосі. Вось ужо конь выскачыў на гладкі гасцінец, а я ўсё плачу. І тады бацька выцягвае з нейкай кішэні вельмі прыгожы жмуток паперак… Грошы!..

— Не плач, Казючок, гэта табе ўсё на цукеркі! — кажа ён.

І слёзы на вачах маіх пачынаюць высыхаць. Што-што, а смак цукерак я ўжо даўно ведаю, бо наша цётка Маня працуе

*Мікола Аўрамчык*

## ВЫТОК

*Казіміру Камейшу*

Толькі памяць глыбей крані —
І адчуеш, што не ў пародзе
Нашы родныя карані,
А ў самім жыцці і ў прыродзе.

Вырас ты ў Навіках Малых.
Там здаваў жыццёвы экзамен.
Навікі ля Плёсаў маіх
На Бабруйшчыне ёсць таксама.

Справа ў Нёман цячэ Сула
Праз абшар тваіх Налібокаў,
Да Бярэзіны ў нас Ала
Шлях трымае з левага боку.

Там загоны: сіні — льняны,
Ружавата-бялюткі — грэчкі,
Жоўты з зеленню — прасяны —
Каляровыя нашы рэчкі.

Знаю: бацька твой быць не мог
Майстрам у верхалазным спорце,
Але ўмее завершваць стог
І на дубе прыладжваць борці.

## *Мікола Маляўка*

# НА МІГ СПЫНІЎСЯ —
# ПА ДАРОЗЕ Ў ВЕЧНАСЦЬ

*Казіміру Камейшу*

Мы нарадзіліся з табой зімой
І гартаваліся ў народнай гушчы.
Ты верны сябар, светлы і трывушчы
У век камп'ютарны — з душой жывой,
Без німба велічы над галавой.
То побач, як радня, то невідушча
Цябе ў жыцці падтрымлівае пушча,
Мяне другі сучаснік — Нёман мой.

Па страчанаму ў небе не журыся,
Хапае клопатаў зямных унізе.
Не дужа грэшны, не зусім святы,
Працуй і доўжы шлях: яшчэ не вечар, —
І на прыпынку юбілейным ты
На міг спыніўся —
Па дарозе ў вечнасць.

*2018*

## *Алесь Марціновіч*

# САМЫ ЛЯСНЫ ПАЭТ

Паэтаў у нас, несумненна, шмат і розных. Таленавітых і менш адораных, народных і тых, хто гэтага звання не атрымаў, лірыкаў і эпікаў, прыхільнікаў «чыстай красы» і філосафаў. Дый яшчэ якіх хочаш заўгодна. І кожны з іх абавязкова чымсьці адметны. Зразумела, калі не браць у разлік графаманаў, якіх апошнім часам распладзілася, як той саранчы. А колькасць іх з зайздроснай

рэгулярнасцю літаральна на вачах павялічваецца. Хоць мала сярод прызнаных талентаў такіх, якія б аддавалі перавагу нейкай адной тэме. Толькі нездарма кажуць, што ў любым правіле ёсць выключэнне. Пацвярджэнне таму — творчасць, а таксама жыццё Казіміра Камейшы, які, як нямногія, адчувае сваю повязь з малой радзімай.

Пра гэта ён і не забывае нагадаць, вяртаючыся да сваіх вытокаў: «Я самы лясны паэт у нашай літаратуры. І не таму, што адтуль, з лесу, і мая калыска, і хата, а ўсе мае думкі, нават беды і радасці. Малыя Навікі — на пачатку самой Налібоцкай пушчы. А Нёман для мяне бацька, а маці — яго прыток Сула». Як і пра тое напамінае, што наступ цывілізацыі далёка не лепшым чынам уплывае на прыроду: «Была і яшчэ адна, самая блізкая да мяне і маёй хаты рэчка, чамусьці з той гістарычна страшнай назвай — Лубянка. Яе даўно няма, яна — ахвяра мацэпураўскага плуга. Выпрамілі і асушылі. “Выкапкам” у маім дзяцінстве працаваў спраўна».

Ды хоць прыкрае і не забываецца, памятаецца і добрае. Тое, што, разам узятае, змяшчаецца ў двух такіх дарагіх для цябе словах — Малыя Навікі. Гэта вёска, у якой К. Камейша нарадзіўся ў самым пачатку зімы, 3 снежня 1943 года. Вёска была невялікая, толькі нейкія дваццаць тры хаты. Хоць і вёскай называцца стала пазней. Раней быў звычайны засценак. Адносіўся ён да Івянецкага раёна. Цяпер гэта Стаўбцоўскі, ці, па-мясцоваму кажучы, Стаўпецкі, раён.

Маленства будучага паэта прайшло сярод маляўнічых мясцін. Там не толькі шуміць спаконвечная Налібоцкая пушча, а і радуе вока ўжо соцень пакаленняў возера Кромань.

Праўда, спачатку ён і не ў Малых Навіках жыў. Амаль да пачатку вучобы ў школе выхоўваўся на хутары Астравы дзеда па маці — Казіміра Радзівона. Па яго імені і сына назвалі Казімірам. Дарэчы, пра сваё маленства Казімір Вікенцевіч хораша расказаў у аповесці «Астравы на сушы». Яна друкавалася ў дванаццатым нумары часопіса «Полымя» за 2015 год і выдадзена асобнай кнігай.

Дзед стаў першым старшынёй мясцовага калгаса. Аднак спачатку, зразумела, гэты калгас яшчэ трэба было стварыць, што

# ЗНАЙСЦІ СЯБЕ Ў СЯБЕ САМОГА

Роздум пра паэзію

Паэзія і ёсць тая самая рэч, дзе ўсё падпарадкавана пошуку. Яна нават не прапаноўвае, а загадвае: «Ідзіце і шукайце!» А дзе ж шукаць? Найперш за ўсё — у сабе самім, чаго і дамагаўся вялікі Аляксандр Твардоўскі і чые словы я вынес у загаловак.

У паэзію кожны прыходзіць сваім шляхам, але заўсёды праз таямніцу, разгадваючы яе, блытаючыся, расчароўваючыся, па многа разоў перакрэсліваючы ўсё, а таямніца і пасля адыходу самога паэта так і застаецца таямніцай. Але шукаць разгадку варта і трэба.

Даўно, яшчэ на самым пачатку, прамовілася: «Я з пушчы». Так і верш назваўся. Так і кнігу потым назваў. Але ў паэзіі нешта толькі прамаўляць — гэтага вельмі мала. Трэба жыць прамоўленым. Я і жыву. А таму і пушча жыве ў кожным маім вершы, пра што б ні пісалася. Нават калі гэта будзе найдалікатнае — скажам, тое ж каханне. А таму я сваю каханую запрашу не ў нейкую там сучасную кавярню, а туды, у пушчанскія сховы, дзе будзе і зялёна, і спеўна, і сумна, і першародна. З усіх нашых паэтаў я, напэўна, самы лясны. Толькі таму «хоць рос я, гледзячы на лес, а вырас, лес шануючы». Шаную яго, малюся на яго і за яго плачу, бо часта бачу, як не шкадуюць яго самі леснікі. Гэта не пахвальба. Памятаю, як некалі таленавіты Міхась Стральцоў, а мы з ім працавалі ў адным аддзеле часопіса «Полымя», зусім не расхвальваючы маіх вершаў, казаў мне: «Падабаецца мне твая вернасць пушчы». І мне гэтага было дастаткова, каб сцвярджаць сабе і іншым тую вернасць. Мне і сёння гэтага дастаткова. І слова «карані» для мяне значыць ой як шмат!

Я нарадзіўся ў былым Івянецкім (зараз гэта Стаўбцоўскі) раёне, у самым пачатку Налібоцкай пушчы. Мая малая радзіма, мая малая вёсачка так і называецца — Малыя Навікі. Тут у самой



**Казімір Вікенцьевіч КАМЕЙША** нарадзіўся 4 снежня 1943 г. у вёсцы Малыя Навікі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыў філалагічны факультэт БДУ (1970). Служыў у Савецкай арміі, працаваў у Капыльскай, Стаўбцоўскай, Валожынскай раённых газетах, у шматтыражцы «Автозаводец», на Беларускім радыё, у часопісах «Полымя», «Вясёлка», «Маладосць», «Вожык».

Аўтар зборнікаў паэзіі «Восеньскія позвы», «Мембрана», «Нектар», «Тут мае вёсны прычалены», «Сябрына», «Плёс», «Галоўная вярста», «Пярэймы дня», «Кубак блакіту», «Лінія Лёсу», «Чмяліны груд», «Высокі бераг» і інш., кніг прозы «Паміж кубкам і вуснамі», «Ад Кромані да Свіцязі», «Гордзіеў вузел», «Астравы на сушы», кніг для дзяцей «Гаёўка», «Буслянка», «Крыгагром» і інш.

Лаўрэат літаратурных прэмій імя Аркадзя Куляшова (1989) і «Залаты Купідон» (2011), Нацыянальнай літаратурнай прэміі (2018). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2020) і медалём Махтумкулі (Туркменістан, 2014).

Казімір Камейша — аўтар шматлікіх артыкулаў і эсэ пра вядомых дзеячаў літаратуры і мастацтва. Плённа працуе і як перакладчык з украінскай, польскай, славацкай, курдскай і армянскай моў.

**ЗМЕСТ**

НА СТЫКУ ДВУХ ВЯКОЎ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Галоўная вярста *(аўтабіяграфія)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Пятак на шчасце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Чорная скібка *(роздум пра Хлеб)* . . . . . . . . . . . . . . . . 35
У прадчуванні новага радка *(навагодні экспромт)* . . . . . . . 74
Два запісы ў працоўнай кніжцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76

СЯБРОЎСКАЕ СЛОВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125

*М. Аўрамчык*. Выток . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
*М. Маляўка*. На міг спыніўся — па дарозе ў вечнасць . . . 127
*А. Марціновіч*. Самы лясны паэт . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
*Р. Барадулін*. Верасовая кніга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134

ЗНАЙСЦІ СЯБЕ Ў СЯБЕ САМОГА… *(роздум пра паэзію)* . . . 139

ПОСТАЦІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144

Непаўторны Куляшоў *(А. Куляшоў)* . . . . . . . . . . . . . . . 144
Праз віхуры і далечы *(А. Звонак)* . . . . . . . . . . . . . . . . 147
Мы развіталіся ў вясне *(М. Аўрамчык)* . . . . . . . . . . . . . 153
Правабярэжац . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 160

*Пра аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 162